Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 19 (507)

Кінакрокі

Мікалай ІЗВОЛАЎ:

«На маёй памяці адкрыццё такога маштабу здарылася ўпершыню»

ГЭТА была сенсацыя: у 2018 годзе на прэстыжным кінафестывалі IDFA ў Амстэрдаме быў паказаны страчаны фільм Дзігі Вертава — хлопца з Беластока, савецкага рэжысёра, кінаавангардыста, які лічыцца заснавальнікам, тэарэтыкам і амаль што богам дакументальнага кіно. Прычым не проста фільм, а самы яго першы фільм — «Гадавіна рэвалюцыі», — зроблены і паказаны ў 1918 годзе. То-бок публіка зноў убачыла карціну роўна праз сто гадоў, ды яшчэ з такім візуальным матэрыялам, каштоўнасць якога сёння складана вымераць, усё ж дакумент часу. Стужкі Вертава, у прыватнасці «Чалавек з кінаапаратам», — што Біблія для дакументалістаў, без работ рэжысёра не абыходзяцца спісы найвялікшых фільмаў свету, яго эксперыменты паўплывалі на ўсю гісторыю кіно. Таму не дзіўна, што «Гадавіна» сабрала безліч аншлагаў у маштабным рэйдзе па кінафестывалях і чатыры тыдні пратрымалася ў камерцыйным пракаце ў Маскве, што нядрэнна нават для сучасных іграваых стужак. А ўзнавіў фільм маскоўскі кіназнаўца, архівіст і рэстаўратар кіно Мікалай Ізволаў, і зрабіць гэта яму дазволіла абсалютная і шчаслівая выпадковасць. Сёння «Гадавіну рэвалюцыі» можна паглядзець у анлайн-кінатэатрах Okko і «КінаПошук», і пад гэтую справу мы распыталі Мікалая аб рабоце над фільмам, «Гадавіне» і Вертаве.

Фота Аляксандра МЕХАНОШЫНА.

— Каб гледачы маглі зноў убачыць «Гадавіну рэвалюцыі», трэба было не проста знайсці згублены фільм, а літаральна сабраць яго па кавалках. Узнікае пытанне, наколькі добра захаваўся архіў савецкага кіно?

— Праблема захаванасці ранніх фільмаў ва ўсіх краінах прыкладна аднолькавая: як у СНД, так і ў Еўропе і ЗША загінула каля 80 % нямога кіно. Кінавытворчасць была прыватная, а прыватныя арганізацыі банкрутуюць, перапрадаюць правы, знікаюць — ніхто не захоўваў плёнкі, якія выйшлі з ужытку. Толькі калі з'явіліся дзяржаўныя архівы, фільмы сталі збірацца — у Савецкім Саюзе такі архіў (ён існуе да сённяшняга дня) быў арганізаваны ў 1926 годзе ў Краснагорску, таму савецкія дакументальныя карціны — дзіўная справа — захаваліся нават лепш, чым у іншых краінах. У свеце архівы часцей з'яўляліся ў канцы 1930-х альбо ўжо пасля Другой сусветнай, так што ранняе гукавое кіно таксама моцна пацярпела. Але кіно гіне і на нашых вачах: многае, напрыклад, было страчана пасля распаду Савецкага Саюза, таму кіно 90-х захавалася горш, чым кіно 80-х.

— Калі знаходкі накшталт першага фільма Вертава дагэтуль магчымыя, значыць, архівы вывучаныя не да канца.

— Знаходкі магчымыя самыя розныя: мы не ведаем, што захоўваецца ў ЗША, Нарвегіі або Японіі, а ў архівах чужых краін дагэтуль можна нечакана выявіць нешта накшталт зніклага фільма Джона Форда. У часы нямога кіно дастаткова было пераляпіць надпіс — і без усялякай агучкі нямецкі фільм станавіўся французскім, а рускі — італьянскім. Але нават калі нешта недзе захавалася, яго назва або зменена, або перакладзена на іншую мову, таму шукаць фільмы даволі складана. Рэвалюцыя і Грамадзянская вайна, калі вяртацца да Дзігі Вертава, ніяк не спрыялі захаванню кіно. Прамысловасць абвалілася — плёнка не вырабляласся, замежжа было адрэзана, а спекулянты на прыгранічных тэрыторыях не маглі забяспечыць цэлую галіну. Таму не ўсе падзеі здымаліся, фільмы друкаваліся невялікімі тыражамі, а негатывы выкарыстоўваліся паўторна. У выніку хроніка таго часу ўяўляе сабой нешта вінегрэтападобнае, з чаго сёння мы з цяжкасцю можам сабраць зыходныя «моркву» ці «бурачок».

— Аднавіць фільм дапамагла, можна сказаць, выпадковая знаходка — у чым у гэтым выпадку заключалася ваша роля як рэстаўратара?

— «Гадавіна рэвалюцыі» па тых часах была незвычайна вялікай карцінай (саступала хіба што «Нецярпімасці» Грыфіта, але ў «Нецярпімасці» — мільённы бюджэт, а тут усё рабілася на каленцы, без грошай, у абсалютна беднай, спустошанай краіне), якую выпусцілі ў 30 ці 40 экзэмплярах, у той час як кіначасопісы выходзілі накладам у пяць экзэмпляраў. Мабыць, фільм трэба было разаслаць па гарадах, дзе ўсталявалася савецкая ўлада, і сам Дзіга Вертаў ездзіў і паказваў яго на так званых агітцягніках. Калі цягнікі спынілі работу, стужка ў ліку іншых была здадзена на склад, дзе даляжала да стварэння дзяржаўнага архіва. «Гадавіна» захавалася буйнымі фрагментамі: справа ў тым, што яна была зроблена з кіначасопісаў і так спрытна злеплена, што кожная каробка магла служыць асобным фільмам — «Лютаўская рэвалюцыя ў Петраградзе», «Разгон Устаноўчага сходу» ці «Мозг савецкай Расіі», дзе паказваліся партрэты палітычных дзеячаў. Наша задача заключалася ў тым, каб ідэнтыфікаваць гэтыя фрагменты, але да 2017 года ў нас не было дакладнага апісання карціны, пакуль на адной з канферэнцый ва УДІКу Святлана Ішэўская не зрабіла даклад пра Вертава і Маякоўскага, дзе паказала адзін цікавы дакумент. Я ўбачыў яго і абамлеў: на вялікім экране была афіша «Гадавіны рэвалюцыі» з усімі надпісамі з фільма. Я ўзброіўся гэтым спісам і стаў метадычна прачэсваць хроніку 1917—1918 гадоў — і карціна пачала знаходзіцца вялікімі кавалкамі.

— На прыкладзе «Гадавіны рэвалюцыі» раскажыце, з якімі дылемамі сутыкаецца рэстаўратар кіно.

— Галоўная праблема — утрымацца ад адсябяціны. Мы павінны зрабіць фільм такім, якім бы яго зрабіў рэжысёр, і не маем права нешта паляпшаць, нават калі нам здаецца, што так будзе больш эфектна ці дынамічна. Паводле прафесійнай этыкі рэстаўратара ўнесці нешта сваё значыць пацярпець паражэнне. Надпісы, якія ў «Гадавіне» прыйшлося аднавіць, я спецыяльна зрабіў іншым шрыфтам: так бачна, што яны належаць не Вертаву. Падобнае пытанне ўзнікла да якасці: мы маем справу з моцна падрапанымі плёнкамі, і хоць, выкарыстоўваючы новыя тэхналогіі, можам палепшыць выяву, ці будзе гэта справядліва ў адносінах да гістарычнай праўды, бо калі Вертаў, скажам, манціраваў эпізод пра Лютаўскую рэвалюцыю, ён ужо меў справу з падрапанымі плёнкамі, і першыя гледачы бачылі яго менавіта такім.

— На кінафестывалі IDFA «Гадавіну» назвалі «першым поўнаметражным дакументальным фільмам у гісторыі». Наколькі гэта праўда?

— Можа быць, праўда, а можа быць, і няпраўда, але за паўтара года з моманту прэм'еры ніхто гэта азначэнне не абверг. Потым жа «Гадавіна» — мантажны фільм, складзены з кіначасопісаў калаж, то-бок Вертаў, мабыць, воляю лёсаў аказаўся першапраходцам у гэтым кірунку, прынамсі, я не ведаю ні адной больш ранняй мантажнай стужкі такога памеру. Думаю, работа над першым фільмам паўплывала на рэжысёра: калі Вертаў рабіў, напрыклад, «Шостую частку свету», ён пісаў аператарам запіскі-планы, і тыя раз'язджаліся па краіне, а калі зняты матэрыял сцякаўся ў Маскву, Вертаў яго манціраваў, гэта значыць ён не прысутнічаў пры здымцы ніводнага эпізоду.

— Вертаў атрымаў «Гадавіну», можна сказаць, выпадкова — таму што ў Маскве не засталося рэжысёраў. Пры гэтым дэбют, падобна, даў яму дарогу ў кіно...

— Сам Вертаў называў гэты фільм сваім вытворчым іспытам, і, відавочна, ён выканаў пастаўленую перад ім задачу, што захавала яго ў прафесіі. Хоць рэжысёраў дакументальнага кіно тады яшчэ не было. Само гэтае слова тут здавалася дзікунствам: як гэта — рэжысёр дакументальнага кіно, як можна рэжысіраваць рэальнасць? Абсурд! Праз год, у 1919-м, Вертаў паспрабаваў паставіць сваё імя ў цітрах фільма «Інструктарскі параход «Чырвоная зорка» — быў скандал, яму не дазволілі гэтага зрабіць, але ідэя тым не менш нарадзілася, у рэшце рэшт чалавек, які робіць дакументальныя фільмы, павінен быў неяк назвацца і назваўся рэжысёрам. Мабыць, менавіта Дзіга Вертаў першы ўкараніў гэта азначэнне ў свядомасці людзей, і гэта было сапраўды рэвалюцыйна.

— «Гадавіна рэвалюцыі» стала адной з першых прапагандысцкіх карцін савецкай улады, але тут няма той агітацыйнай настойлівасці, якая з'явілася ў савецкім кіно пазней. Вам самому якой бачыцца інтанацыя карціны?

— У розны час слова «прапаганда» трактуецца па-рознаму. У 1970—1980-я яно асацыявалася з прымітыўнымі кандовымі формамі накшталт плакатаў «Слава КПСС!» і выклікала пачуццё, блізкае да аскомы. Але ў 1920-я агітатар і прапагандыст успрымаліся інакш — як людзі, якія вядуць за сабой, а тады кожны крычаў і агітаваў за нешта сваё, вулічныя мітынгі былі штодзённасцю. Успомніце Маякоўскага: «Слушайте, товарищи потомки, агитатора, горлана-главаря». Ці была «Гадавіна рэвалюцыі» прапагандысцкай? У тым сэнсе, у якім любы інфармацыйны матэрыял — прапагандысцкі. Бо рэвалюцыя адбывалася ў Петраградзе і Маскве, а аднакуль людзі ў іншых гарадах, скажам, за сто кіламетраў ад сталіцы, маглі даведацца,

Дзіга Вертаў, альбо Давід Каўфман, — савецкі рэжысёр, найкласічнейшы кінааўтар, адзін з заснавальнікаў і тэарэтыкаў дакументальнага кіно, стваральнік канцэпцыі «жыцця знянацку». Ён нарадзіўся ў Беластоку, скончыў псіханеўралагічны інстытут у Петраградзе і пайшоў працаваць у аддзел кінахронікі Маскоўскага кінакамітэта, які даў старт яго кар'еры. У 1920-х вакол аўтара сфарміравалася авангарднае аб'яднанне «Кінокі», што супрацьпастаўляла сябе традыцыйным кінематаграфістам. У 1924 годзе разам са сваім братам аператарам Міхаілам Каўфманам Дзіга Вертаў зняў карціну «Кіна-вока», у якой пачынае яскрава выяўляцца эксперыментальная эстэтыка рэжысёра. У 1929-м Вертаў выпусціў «Чалавека з кінаапаратам», што лічыцца адным з найлепшых і найважнейшых фільмаў у гісторыі кіно. «Сімфонія Данбаса» — адна з першых гукавых дакументальных карцін. У пэўным сэнсе рэжысёр стаў ахвярай савецкай сістэмы: яго фільм «Тры песні пра Леніна» не спадабаўся Іосіфу Сталіну і лёг на паліцу, пасля чаго Вертаву даверылі зняць толькі стужку «Калыханка», ужо пра Сталіна, якая таксама прыйшлася не даспадобы кіраўніку краіны. Больш вялікіх праектаў рэжысёр не атрымліваў. Памёр у 1954 годзе.